


Раздзел II

# ГІСТОРЫЯ САВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ 1917—1939 гг.

## § 9. Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады ў Расіі

*1. Якія нявырашаныя праблемы перашкаджалі мадэрнізацыі Расіі? 2. Назавіце асноўныя вынікі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. 3. У чым выявіўся ўнутрыпалітычны крызіс у краіне да кастрычніка 1917 г.?*

Першая сусветная вайна стала межавым перыядам у расійскай гісторыі. Агульнанацыянальны крызіс, выкліканы гэтай вайной, завяршыўся падзеннем самадзяржаўя і ўсталяваннем савецкай улады.

**Курс бальшавікоў на ўзброенае паўстанне.** Пасля Лютаўскай рэвалюцыі перад Расіяй адкрываліся два варыянты развіцця падзей: рэфарматарскі і радыкальны. Рэфарматарскага варыянта прытрымліваўся Часовы ўрад. Праваднікамі і ўдзельнікамі радыкальнага варыянта маглі стаць як правыя сілы (манархісты), так і левыя (эсэры, бальшавікі, меншавікі).

Тагачасная палітычная сітуацыя ў цэлым была спрыяльнай для Часовага ўрада. Пасля падзення самадзяржаўя спынілі існаванне крайне правыя манархічныя арганізацыі. Пад уплывам рэвалюцыйных падзей змянілі сваю пазіцыю лібералы. Кадэты, напрыклад, адмовіліся ад ідэі канстытуцыйнай манархіі на карысць усталявання дэмакратычнай парламенцкай рэспублікі. Іх аўтарытэт значна ўзрос. Партыі эсэраў і меншавікоў заявілі аб падтрымцы Часовага ўрада. Гэтыя дзве найбольш магутныя і ўплывовыя палітычныя сілы выступілі за працяг вайны, якая, на іх думку, павінна была абараняць рэвалюцыйныя заваёвы. Нават кіраўніцтва Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП), якое знаходзілася ў эміграцыі, умоўна падтры-

Правообладатель Издательский центр БГУ

мала Часовы ўрад, надзелены паўнамоцтвамі да склікання Усерасійскага Устаноўчага сходу.

З сакавіка па ліпень 1917 г. у Петраградзе існавала так званае *двоеўладдзе*. Гэта значыла, што былі два цэнтры ўлады: з аднаго боку, Часовы ўрад, з другога — Петраградскі Савет рабочых і сялянскіх дэпутатаў (Петрасавет). Ва ўмовах двоеўладдзя Часовы ўрад дзейнічаў нерашуча і часта непаслядоўна. Ён не мог у поўнай меры кіраваць узброенымі сіламі, бо згодна з загадам Петрасавета № 1 ад 1 (14*) сакавіка 1917 г. афіцэры пазбаўляліся рэальнага камандавання, якое пераходзіла да выбарных салдацкіх камітэтаў. Але самае галоўнае — Часовы ўрад так і не змог знайсці сацыяльнай апоры сярод салдат і рабочых у сталіцы. Ён, па сутнасці, праігнараваў найбольш вострыя пытанні, якія ўзнялі паўстанцы ў лютаўскія дні. Не было вырашана пытанне аб 8-гадзінным працоўным дні. Урад нічога не зрабіў для спынення вайны і вырашэння аграрнага пытання.

Сітуацыя рэзка змянілася пасля прыезду з эміграцыі кіраўніцтва бальшавіцкай партыі на чале з ***У. І. Леніным***. Ад «умоўнай» падтрымкі Часовага ўрада бальшавікі перайшлі да адкрытай барацьбы за ўладу. Ленін быў першым палітыкам, які заявіў, што рэвалюцыя не завершаная і што неабходна перадаць уладу ў рукі рабочых і сялян. Яго палітычная праграма адлюстроўвала надзеі і спадзяванні шырокіх пластоў насельніцтва. Яна ўключала наступныя палажэнні: «рэвалюцыйны выхад з вайны» (заключэнне міру без ***анексій*** і кантрыбуцый), адмова ад любой падтрымкі Часовага ўрада і перадача ўсёй улады ў рукі Саветаў, увядзенне рабочага кантролю над вытворчасцю і размеркаваннем, бязвыплатная перадача памешчыцкай зямлі сялянам, рэалізацыя права нацый на самавызначэнне.

Часовы ўрад увайшоў у паласу зацяжных палітычных крызісаў. Найбольш востры з іх прыпаў на *ліпеньскія дні 1917 г.* 3 (16) ліпеня ў Петраградзе пачаліся стыхійныя антыўрадавыя выступленні пад лозунгамі адстаўкі ўрада і перадачы ўлады Саветам. *4 (17) ліпеня* адбыліся крывавыя сутыкненні паміж урадавымі войскамі і дэманстрантамі. Урад атрымаў часовую перамогу над бальшавікамі. Пасля ліпеньскіх падзей Расійская сацыял-дэмакратычная партыя (бальшавікоў) адкрыта абвясціла аб падрыхтоўцы да ўзброенага паўстання.

Між тым Часовы ўрад на чале з ***А. Ф. Керанскім*** праяўляў поўную бездапаможнасць і, па сутнасці, быў не ў стане кіраваць велізарнай краінай. Навісла рэальная



А. Ф. Керанскі.
Мастак *І. Бродскі*. 1917 г.

* Тут і далей даты ў дужках падаюцца паводле новага стылю.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Крэйсер «Аўрора» халастым стрэлам 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. у 21 гадз 40 хв абвясціў аб пачатку штурму Зімняга палаца

пагроза паглыблення Расіі ў бездань безуладдзя і анархіі. Каб не дапусціць гэтага, Вярхоўны галоўнакамандуючы генерал ***Л. Г. Карнілаў*** прыняў рашэнне ўвесці ў краіне ваенны рэжым. У *жніўні 1917 г.* ён рушыў войскі да Петраграда. Напалоханы Керанскі звярнуўся па падтрымку да ўсіх левых сіл. У адказ бальшавікі распачалі стварэнне Чырвонай гвардыі і ўзмацнілі агітацыю ў войску. Войскі Карнілава былі раззброены, а сам ён арыштаваны. Так адкрылася перспектыва левадыкальнага варыянта развіцця падзей.

**Перамога паўстання ў Петраградзе.** Бальшавіцкая партыя ўжо ўяўляла сабой рэальную і самую аўтарытэтную сілу ў Петраградзе. В. І. Ленін меркаваў, што склалася ўнікальная сітуацыя, калі бальшавікі могуць узяць уладу ў свае рукі. Ён асабіста распрацаваў план узброенага захопу ўлады. Ідэю мірнага прыходу да ўлады праз Устаноўчы сход ён лічыў небяспечнай і недапушчальнай.

Часовы ўрад быў праінфармаваны аб магчымым выступленні, аднак меры, прынятыя для яго прадухілення, былі недастатковымі. Да раніцы ***25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г.*** практычна без усякага супраціўлення бальшавікі ўзялі пад свой кантроль найважнейшыя стратэгічныя аб'екты сталіцы: вакзалы, масты, тэлеграф, электрастанцыю. Увечары гэтага ж дня на *II Усерасійскім з'ездзе Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў* было абвешчана пра пачатак штурму Зімняга палаца, дзе знаходзіўся Часовы ўрад. Дэпутаты ад правага крыла партыі эсэраў і меншавікоў абвінавацілі бальшавікоў у путчы, г. зн. дзяржаўным перавароце, і пакінулі пасяджэнне. Бальшавікі і левыя эсэры, што засталіся ў зале, абвясцілі Расію Рэспублікай Саветаў.

№ 8

На пасяджэнні 26 кастрычніка (8 лістапада), пасля ўзяцця Зімняга палаца і арышту Часовага ўрада, былі прынятыя першыя дэкрэты новай улады: *Дэкрэт аб міры* і *Дэкрэт аб зямлі*. Новы сфарміраваны ўрад — *Савет Народных Камісараў (СНК)* — узначаліў У. І. Ленін. Такім чынам, новая ўлада дала адказ на тыя пытанні, якія былі ў цэнтры ўвагі грамадскага і палітычнага жыцця.

**Усталяванне савецкай улады ў Расіі.** У. І. Ленін лічыў, што для зацвярджэння ўлады бальшавікоў ва ўсёй краіне неабходная была перамога ў двух галоўных гарадах — Петраградзе і Маскве. Гэтага было дастаткова, каб «пацягнуць за сабой усю Расію». Аднак у адрозненне ад Петраграда ў Маскве ўсталяванне савецкай улады суправаджалася жорсткімі баямі, вялікай колькасцю ахвяр і завяршылася толькі 2 (15) лістапада.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Парад часцей Чырвонай Арміі. 1920 г. Да сярэдзіны 1919 г. быў завершаны працэс стварэння асноў рэгулярнай Чырвонай Арміі. Да канца 1919 г. яе колькасць дасягнула 3 млн, а да восені 1920 г. — 5,5 млн чалавек

*Высветліце, чаму днём нараджэння Чырвонай Арміі лічыцца 23 лютага.*

У лістападзе ўлада Саветаў была ўсталявана ва Украіне, у Беларусі, Прыбалтыцы, у Баку. Перыяд з кастрычніка 1917 г. да лютага 1918 г. увайшоў у гісторыю пад назвай *трыумфальнага шэсця савецкай улады*. З 97 буйны́х гарадоў мірным гэты пераход быў у 79 выпадках.

У той жа час выбары ва Устаноўчы сход, якія адбыліся ў лістападзе 1917 г., паказалі, што 76 % выбаршчыкаў не падтрымліваюць бальшавікоў. Перавага была на баку эсэраў, меншавікоў і кадэтаў. У адказ на гэта бальшавікі разагналі Устаноўчы сход, забаранілі партыю кадэтаў і выданне апазіцыйных газет.

Для «барацьбы з контррэвалюцыяй і сабатажам» была створана *Усерасійская надзвычайная камісія (УНК)*, якая мела неабмежаваныя паўнамоцтвы і адыграла вялікую ролю ва ўсталяванні савецкай улады. У студзені 1918 г. пачала стварацца апора савецкай улады — *Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія*.

Асноўныя прынцыпы нацыянальнай палітыкі былі абвешчаны ў *«Дэкларацыі правоў народаў Расіі»*. У адпаведнасці з ёй у снежні 1917 г. Савецкая Расія прызнала незалежнасць Польшчы і Фінляндыі.

12 студзеня 1918 г. адбыўся III Усерасійскі з'езд Саветаў, які прыняў *«Дэкларацыю правоў працоўнага і эксплуатаванага народа»*. Найвышэйшым заканадаўчым органам абвяшчаўся *з'езд Саветаў*, а паміж з'ездамі — *Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (УЦВК)*. На з'ездзе была абвешчана *Расійская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка (РСФСР)*. У ***ліпені 1918 г.*** была прынята Канстытуцыя Савецкай Расіі.




Першая савецкая Канстытуцыя, якая вызначыла асноўныя прынцыпы будовы новай дзяржавы

Правообладатель Издательский центр БГУ



Перамовы ў Брэст-Літоўску. 1918 г.

**Брэсцкі мір.** Адной з найбольш вострых праблем, якія стаялі перад савецкай уладай, быў выхад Расіі з Першай сусветнай вайны. Распачатыя перамовы з нямецкім камандаваннем у Брэст-Літоўску сарваў народны камісар па замежных справах РСФСР Л. Д. Троцкі, які адхіліў патрабаванні германскага боку. Скарыстаўшыся гэтым, германскія войскі сталі наступаць па ўсёй лініі фронту і занялі Мінск, Полацк, Оршу, Талін і іншыя населеныя пункты. ***3 сакавіка 1918 г.**** савецкая дэлегацыя ў новым складзе падпісала ў Брэсце мірны дагавор з Германіяй на яшчэ больш цяжкіх умовах. Ад Расіі адыходзілі Літва, Латвія, частка Беларусі. Украіна і Фінляндыя прызнаваліся самастойнымі дзяржавамі. Расія абавязалася перадаць Германіі караблі Чарнаморскага флоту і выплаціць ёй вялікую грашовую кантрыбуцыю.

№ 9

Брэсцкі мір быў адным з самых зневажальных за ўсю гісторыю Расіі. І хоць бальшавікі атрымалі кароткачасовую перадышку ад вайны з Германіяй, негатыўныя наступствы Брэсцкага міру неўзабаве сталі відавочныя. Пасля заканчэння Першай сусветнай вайны Расія страціла ўсе перавагі дзяржавы-пераможцы. Вяртанне з франтоў вялікай масы людзей, якія прывыклі ваяваць, спрыяла распальванню грамадзянскай вайны. У адказ на падпісанне ***сепаратнага міру*** Савет Антанты прыняў рашэнне аб інтэрвенцыі ў Расію. Замест вайны з аслабленай Германіяй бальшавікам прыйшлося ваяваць з 19 дзяржавамі Антанты.

1. Якія найбольш важныя праблемы стаялі перад Расіяй вясной — восенню 1917 г.? Параўнайце пазіцыю па гэтых пытаннях Часовага ўрада і бальшавікоў.
2. Чым было выклікана рашэнне Л. Г. Карнілава ўсталяваць у Расіі ваенны рэжым? Якія наступствы меў Карнілаўскі мяцеж?
3. Апішыце працэс захопу ўлады бальшавікамі ў Расіі. Якія пераўтварэнні ажыццявілі бальшавікі, прыйшоўшы да ўлады?
4. Як была арганізавана сістэма дзяржаўнага кіравання ў Савецкай Расіі? Складзіце схему.
5. Ахарактарызуйце значэнне мірнага дагавора Савецкай Расіі з Германіяй.
6. Адным з сімвалаў Кастрычніцкай рэвалюцыі з'яўляецца чырвоны гваздзік. Што яшчэ вы б прылічылі да палітычных сімвалаў гэтай гістарычнай падзеі?

* 31 студзеня (14 лютага) 1918 г. РСФСР перайшла на новы стыль вылічэння часу.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Выступаючы на пасяджэнні Петраградскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г., У. І. Ленін прамовіў: «Таварышы! Рабочая і сялянская рэвалюцыя, пра неабходнасць якой увесь час гаварылі бальшавікі, здзейснілася». У якой ступені, на ваш погляд, была непазбежная Кастрычніцкая рэвалюцыя? Чаму бальшавікі здолелі ўзяць уладу?



**Уладзімір Ільіч Ленін** (сапр. прозвішча — Ульянаў; 1870—1924) — савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, рэвалюцыянер. З залатым медалём скончыў Сімбірскую гімназію. Адзін з аднакласнікаў казаў пра Леніна, што «здольнасці ён меў надзвычайныя, валодаў велізарнай памяццю, адрозніваўся прагнай навуковай цікаўнасцю і нерэальнай працаздольнасцю». Моцнае ўражанне на будучага правадыра пралетарскай рэвалюцыі зрабіла гібель старэйшага брата Аляксандра, якога пакаралі смерцю ў 1887 г. як удзельніка нарадавольскай змовы, арганізаванай з мэтай замаху на жыццё імператара Аляксандра III. У 1903 г. на II з'ездзе РСДРП узначаліў бальшавіцкую фракцыю. Выпрацаваў асновы эканамічнай і культурнай палітыкі савецкай улады, сфармуляваў прынцыпы аб'яднання савецкіх рэспублік у складзе СССР. Значна паўплываў на ход сусветнай гісторыі XX ст.

# § 10. Грамадзянская вайна

*1. З якой мэтай партыя бальшавікоў пайшла на заключэнне Брэсцкага міру? 2. Пералічыце краіны, якія былі саюзнікамі Расіі ў гады Першай сусветнай вайны.*

Грамадзянская вайна ў Расіі пачалася адразу ж пасля захопу ўлады бальшавікамі ў кастрычніку ***1917 г.*** і скончылася разгромам Белай арміі на Далёкім Усходзе восенню ***1922 г.*** На працягу гэтага часу розныя сацыяльныя класы і групоўкі вырашалі супярэчнасці, якія ўзніклі паміж імі, узброенымі метадамі.

**Асноўныя прычыны і этапы Грамадзянскай вайны.** Асноўнымі прычынамі Грамадзянскай вайны былі незадаволенасць буржуазіі і памешчыкаў, якія страцілі ўладу і правы на ўласнасць у выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі; імкненне бальшавікоў утрымаць уладу любой цаной; разгон Устаноўчага сходу; ліквідацыя таварна-грашовых

Правообладатель Издательский центр БГУ